**Г. І. Галавенка,** настаўнік рускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі Пескаўскага ВПК
дзіцячы сад-сярэдняя школа Мастоўскага раёна

**Класная гадзіна «Уверх па лесвіцы жыцця, або Мае жыццёвыя каштоўнасці»**

Як абудзіць цікавасць старшакласнікаў да праблем самапазнання і самаўдасканалення? Як спрыяць усведамленню падлеткамі значнасці ўласнага жыцця, яго мэтаў, разумення сваіх сіл і магчымасцей? Як дапамагчы дзецям зразумець, што мае каштоўнасць, а што не мае? Адказы на гэтыя і іншыя пытанні прадстаўлены ў распрацоўцы сцэнарыя класнай гадзіны «Уверх па лесвіцы жыцця, або Мае жыццёвыя каштоўнасці». Эпіграфам да гэтага мерапрыемства выбраны словы Гі дэ Мапасана: «Жыццё – гэта гара: падымаешся павольна, спускаешся хутка». Падчас занятку старшакласнікі будуюць уласную «лесвіцу жыцця», якая складаецца з «лесвіцы жаданняў» і «лесвіцы дасягненняў».

***Сцэнарый класнай гадзіны па фарміраванні ў падлеткаў жыццёвых каштоўнасцей прадстаўлены на сайце часопіса***

**Г. І. Галавенка,** настаўнік рускай мовы і літаратуры
першай катэгорыі Пескаўскага ВПК
дзіцячы сад-сярэдняя школа Мастоўскага раёна

# Класная гадзіна «Уверх па лесвіцы жыцця, або Мае жыццёвыя каштоўнасці»

**Мэта**: арыентацыя падлеткаў на сапраўдныя жыццёвыя каштоўнасці.

**Задачы:**

1) дапамагчы падлеткам выразна размяжоўваць сапраўдныя і ўяўныя каштоўнасці;
2) абудзіць цікавасць старшакласнікаў да праблем самапазнання і самаўдасканалення;
3) спрыяць усведамленню падлеткамі значнасці ўласнага жыцця, яго мэтаў, разумення сваіх сіл і магчымасцей;
4) дапамагчы падлеткам разабрацца ў складаным, разнастайным свеце людзей;
5) развіваць каштоўнасныя адносіны выхаванцаў да жыцця;
6) выхоўваць здольнасць успрымаць свет з любоўю і радавацца жыццю.

**Форма правядзення:** размова-дыялог.

**Метады, прыёмы і формы:** праблемна-пошукавы,славесны, эўрыстычны, элементы індуктыўнага і дэдуктыўнага метадаў,вуснае выступленне, франтальнае апытванне, індывідуальная работа, самастойная работа, калектыўная работа, работа ў групах.

**Абсталяванне:** камп'ютар, мультымедыйны праектар, экран,раздатачны матэрыял.

## Ход занятку

### І. Матывацыйна-арыентацыйны этап

*(Выяўленне эмацыянальна -псіхалагічнага настрою выхаванцаў).*

**Практыкаванне «Памяняемся месцамі»**
**Класны кіраўнік:**
- ✓ памяняйцеся месцамі тыя, хто любіць свой клас.
- ✓ памяняйцеся месцамі тыя, у каго добры настрой.
- ✓ памяняйцеся месцамі тыя, хто гатовы сення плённа працаваць.
- ✓ памяняйцеся месцамі тыя, хто хацеў бы даведацца аб чымсьці новым.
- ✓ памяняйцеся месцамі тыя, хто лічыць сябе шчаслівым чалавекам.

**II.Арганізацыйна-пазнавальны этап**
**-А што такое шчасце?**
***Прыкладныя адказы падлеткаў:***
-Гэта калі ўсё атрымліваецца.
-Калі ўсе жывыя і здаровыя.
-Калі ёсць усё, чаго толькі не пажадаеш.
-Калі здзяйсняюцца мары.
-Калі цябе ўсе паважаюць.
-Калі ты вядомы і ўсе табой захапляюцца.
-Калі займаешся любімай справай.
*Від дзейнасці: франтальнае апытванне*
**-А як стаць шчаслівым?**
***Прыкладныя адказы падлеткаў:***
-Выйграць у латарэю.
-Дастаць чароўную палачку.
-Мець багатых бацькоў.
-Знайсці скарб.
- Многа працаваць, каб здзейсніць сваю мару.
-Вельмі хацець быць шчаслівым.
*Від дзейнасці: франтальнае апытванне*
**Прадоўжыце фразы:**
1. Паспяховы чалавек– гэта чалавек, які...
2. Чалавек-няўдачнік – гэта чалавек, які...
3. Калі чалавек не мае________, то ён не адбыўся.
*Від дзейнасці: індывідуальная работа*
**III. Дзейнасна-пазнавальны этап**

**Класны кіраўнік**. Зусім хутка вы пакінеце сцены школы. З якім жыццёвым вопытам? З якім запасам духоўна-маральных якасцей? Няма, напэўна, на Зямлі чалавека, які б не марыў пра шчасце. У кожнага чалавека ёсць дзіўная магчымасць – марыць. Пакуль чалавек жыве, ён аб чымсьці марыць. Часам яго мары становяцца явай, ператвараючыся ў жыццёвыя мэты. Давайце ўявім наша жыццё ў выглядзе лесвіцы, па якой мы ідзем уверх, у будучыню, у дарослае жыццё. Ваша права – выбіраць, якой будзе ваша лесвіца: вялікая ці маленькая, з якіх прыступак будзе яна складацца. Вы можаце лічыць, што кожная прыступка – гэта тое, да чаго вы імкнецеся ў вашым жыцці. Як пабудаваць сваю лесвіцу, каб адчуваць сябе шчаслівым? Як разабрацца ў складаным, разнастайным свеце? Як зразумець – што мае каштоўнасць, а што не мае? Пра гэта мы будзем гаварыць на нашай класнай гадзіне, якую і назавем **«Уверх па лесвіцы жыцця, або мае жыццёвыя каштоўнасці».** Эпіграфам да нашага занятку будуць словы Гі дэ Мапасана:

**«Жыццё – гэта гара: падымаешся павольна, спускаешся хутка».** Але перш чым гаварыць аб жыццёвых каштоўнасцях, я хацела б даведацца, аб чым вы марыце.

***Лесвіца жаданняў***

**Заданне:** напішыце на лесвіцы жаданняў вашы самыя запаветныя жаданні.

<u>(«Лесвіцы жаданняў» прымацоўваюцца да дошкі).</u>

*Від дзейнасці: індывідуальная работа*

**Класны кіраўнік.** Дзякуй за вашыя мары, за вашы жаданні. Яны абавязкова збудуцца! Трэба толькі вельмі гэтага хацець! І трэба дакладна разумець, што мае ў жыцці каштоўнасць, а што не мае. Давайце пагаворым аб сапраўдных і ўяўных каштоўнасцях.

***Сапраўдныя і ўяўныя каштоўнасці***

**Заданне**: укажыце сапраўдныя і ўяўныя каштоўнасці.

(Удзячнасць, добрая адукацыя , прэстыж, шчаслівая сям'я, кар'ера, каханне, **слава, грошы**, сяброўства, павага да людзей, ганарыстасць, здароўе, **улада,** міласэрнасць,сціпласць, ліслівасць, нахабства, працавітасць).

*Від дзейнасці: калектыўная работа*

**Класны кіраўнік**. Вы бачыце, што вылучаны тры словы: «грошы»,

«улада» і «слава». Давайце яшчэ раз паспрабуем вызначыць: гэта сапраўдныя або ўяўныя каштоўнасці?

1) **Грошы**, на якія можна купіць амаль усё;

2) **улада**, якая дае тое, чаго не купіш за грошы;

3) **слава** – знак грамадскага прызнання, калі ты ў вачах захопленых людзей бачыш адлюстраванне свайго жыццёвага поспеху.

<u>**Абмеркаванне сітуацыі**</u> (слухаюцца ўсе меркаванні).

*Від дзейнасці: калектыўная работа*

**- Як вы лічыце, дзеці, ці трывалымі будуць гэтыя прыступкі?**

**Класны кіраўнік.** Я лічу, што гэта ўяўныя каштоўнасці.

<u>**Грошы**</u> – гэта нетрывалая прыступка; нават самы багаты чалавек можа разарыцца і страціць усё. Гэта ўяўная каштоўнасць.

<u>**Уладу**</u> таксама можна страціць: прэзідэнтаў перавыбіраюць, цароў звяргаюць з прастолу. Улада – гэта таксама ўяўная каштоўнасць.

<u>**Слава**</u> – гэта таксама ўяўная каштоўнасць. Славу лёгка страціць. Нават вельмі вядомыя калісьці людзі ў старасці могуць быць нікому не патрэбнымі.
**Класны кіраўнік.** Такім чынам, давайце зробім вывад аб тым, што такое каштоўнасць, якія каштоўнасці лічацца сапраўднымі, а якія ўяўнымі.
**Вывад.** Каштоўнасці – гэта тое, што важна, што мае значэнне. Каштоўнасці трэба падзяляць на сапраўдныя і ўяўныя. Сапраўдныя каштоўнасці – тыя, якія робяць чалавека і свет лепшымі. Каштоўнасці, якія псуюць чалавека, – ўяўныя.
**Класны кіраўнік**. Скажыце, а каштоўнасць і кошт – гэта адно і тое ж?

***Каштоўнасць і кошт***

<u>Каштоўнасць</u> – гэта тое, што важна для жыцця чалавека, той пераважны аб'ект, прысутнасць якога аказвае ўплыў на змястоўны ход жыцця. Каштоўнасць духоўная, адчуваннямі яе не выявіш. Пушкінскае «Не продаётся вдохновенье, но можно рукопись продать» – вельмі дакладна акрэслівае межы кошту і каштоўнасці. Для кошту – рынак, для каштоўнасці – душа. Кошт вычарпаемы і знішчаемы: прадукты харчавання з'ядаюцца, рэчы зношваюцца, жыллё разбураецца – і ўсё гэта падуладна знішчэнню. Каштоўнасць свабодная ад захопу, незнішчальная, невычэрпная. Ідэі Сакрата, творы Рафаэля, музыка Гайдна захавалі сябе наперакор капрызным

выкрутасам гісторыі. Можна забіць чалавека (напрыклад, Джардана Бруна), можна падавіць яго волю (напрыклад, Гамлет), знішчыць носьбіта каштоўнасці, але не саму каштоўнасць.

Кошт заменны: заўсёды знойдзецца тавар, які перавышае другі тавар па якасці, здольны выцесніць папярэдніка. Гісторыя цывілізацыі з гэтага пункту гледжання ёсць бясконцы шэраг тавараў, якія змяняюць адзін другога. Каштоўнасць незаменная: адсутнасць любові не папаўняецца любоўю да іншага; цудоўная сустрэча з выдатным чалавекам не паўтараецца; погляд, кінуты табе як падтрымка, не мае іншага дубля. Цютчаўскае «Нам не дано предугадать, как наше слово отзовётся» – гэта як раз пра ўнікальнасць і незаменнасць імгнення каштоўнаснага праяўлення.

*Від дзейнасці: вуснае выступленне*

***Эстафета сэнсаў***

**Заданне:** давайце ўявім, што шчодры чараўнік гатовы пераўтварыць кватэру, цалкам замяніўшы ў ёй усе прадметы і рэчы новымі, моднымі, дарагімі. Пакінуць дазваляецца з ранейшага толькі штосьці адно. Які выбар вы зробіце, растлумачце яго.

*Від дзейнасці: калектыўная работа*

**Класны кіраўнік.** Такім чынам, тлумачачы свой выбар, вы выходзілі на каштоўнасці. А цяпер давайце разам складзем пералік вечных каштоўнасцей. *(Сумленне, міласэрнасць, любоў, сяброўства, справядлівасць, дабрыня, смеласць, сумленнасць, прыстойнасць і г. д.)*

*Від дзейнасці: калектыўная работа*

**Фізкультхвілінка** *(гімнастыка для вачэй)*

**Заданне:** пералічаны розныя сапраўдныя каштоўнасці; удзельнікі кожнай групы павінны размеркаваць словы па катэгорыях. *(Стараннасць, любоў да бліжняга, здольнасць суперажываць, міласэрнасць, працавітасць, беражлівасць, вера, чуласць, пунктуальнасць, удзячнасць, пакора, павага, любоў да парадку, талерантнасць, спачуванне, адказнасць).*

*Від дзейнасці: работа ў группах*

1 група – каштоўнасці штодзённага жыцця (стараннасць, пунктуальнасць, працавітасць, беражлівасць, адказнасць, любоў да парадку);

– каштоўнасці чалавечых адносін (удзячнасць, павага, спачуванне, талерантнасць);

2 група – каштоўнасці вышэйшай сферы духоўнага жыцця (чуласць, міласэрнасць, здольнасць суперажываць);

– хрысціянскія каштоўнасці (вера, пакора, любоў да бліжняга).

**Класны кіраўнік.** Усе мы хочам быць шчаслівымі. Шчасце – гэта шлях, а не пункт назначэння. Каб прыйсці да канчатковага пункта, трэба паставіць мэту і дабіцца поспеху. Такім чынам, што такое мэта, поспех і шчасце?

**Мэта** – прадмет імкнення, тое, што жадаеш ажыццявіць.

**Поспех** – удача ў дасягненні чаго-небудзь, грамадскае прызнанне, высокія вынікі ў чым-небудзь.

**Шчасце** – пачуццё і стан поўнага вышэйшага задавальнення.

**Заданне**: устанавіце сэнсавую сувязь паміж словамі мэта-поспех-шчасце.

**Дапоўніце фразу:**

«Каб дасягнуць поспеху ў якой-небудзь справе, чалавек ставіць.... .

І, дасягнуўшы...., ажыццявіўшы...., адчувае.... .

*Від дзейнасці: работа ў групах*

**Вывад**. Каб дасягнуць поспеху ў якой-небудзь справе, чалавек ставіць перад сабой жыццёвыя мэты. І, дасягнуўшы поспеху, ажыццявіўшы гэтыя мэты, адчувае шчасце.

**Класны кіраўнік.** Падымаючыся па лесвіцы, мы не заўсёды ідзем упэўнена. Можам памыліцца, можам спатыкнуцца і нават упасці. У жыцці бывае ўсякае: нас суправаджаюць хваробы, расчараванні і нават страты. Наш пад'ём ва многім залежыць ад таго, як мы будзем сябе весці ў адносінах да іншых людзей, якія ідуць разам з намі па лесвіцы: будзем штурхацца, пераступаць праз каго-небудзь, прапускаць уперад, ісці побач. Давайце падумаем над тым, якім будзе наш рух.

**Заданне:** паспрабуйце прадбачыць, змадэляваць розныя сітуацыі, якія могуць ускладніць пад'ём па лесвіцы мары.

*Від дзейнасці: калектыўная работа*

**Заданне:** прачытайце і абмяркуйце сітуацыі.

*Від дзейнасці: абмеркаванне ў групах*

**Сітуацыя 1.** «Мяне завуць Каця. Я адчуваю, як мая хлусня цісне на мяне. Я адчуваю гэты груз. Нават не думала, што так бывае. І я мару пазбавіцца ад гэтага грузу, ад хлусні. Усё пачалося пару гадоў таму. Мяне адлічылі з інстытута. З медыцынскага. Чаму? Гаварыць не буду, вінавата я сама. Так атрымалася... І тады я прыняла жудаснае рашэнне: нічога не казаць бацькам. Чаму я прыняла такое рашэнне? Я думала, што гэта ненадоўга. Вось паступлю зноў, потым раскажу. Але я зноў не паступіла. Тады я вырашыла сур'ёзна рыхтавацца, аддала шмат сіл на падрыхтоўку. І зноў не паступіла!!! Пайшла на завочнае навучанне, на платнае. На грошы, якія сама зарабіла. Але вучуся не ў медыцынскім інстытуце (а я хачу быць урачом!), а ў эканамічным. Так раскайваюся! Так хачу ўсё паправіць! Але я наогул не ўяўляю, як гэта зрабіць. Вельмі сорамна прызнацца бацькам праз столькі гадоў! Ды і ўсе сваякі думаюць, што я вучуся на ўрача. Плюс да ўсяго, я жыву ў вёсцы. А што падумаюць суседзі? Парайце, што мне рабіць!».

**Сітуацыя 2.** «Мяне завуць Наташа. Я вучуся ў 9 класе. У мяне праблема: мама не дазваляе мне сустракацца з маладым чалавекам. Ён старэйшы за мяне на 6 гадоў. Мая сям'я забяспечаная. У таты свая аўтамайстэрня. Мой хлопец працуе ў таты. Нядаўна мы пачалі з ім сустракацца, але мама даведалася пра гэта, моцна крычала на мяне і забараніла мне з ім бачыцца. Яна кажа, што ён значна старэйшы за мяне, што ў яго іншыя інтарэсы, што мне яшчэ рана сустракацца з хлопцамі, што галоўнае для мяне – гэта вучоба. Але я добра вучуся, а нашы сустрэчы не перашкаджаюць вучобе. Мы з ім проста гуляем, размаўляем. Я стараюся гэта растлумачыць маме, але яна не хоча мяне слухаць і адразу пачынае крычаць. Парайце, што мне рабіць!».

**<u>Пытанне для дыскусіі.</u>**

Уявіце сабе такую **сітуацыю**: чалавек не мае падтрымкі сям'і; у яго няма сяброў, яму няма з кім параіцца, няма на каго абаперціся; яму няма да каго пайсці ў госці ці проста каму патэлефанаваць.

-Ці зможа чалавек у такой сітуацыі дасягнуць у сваім жыцці пастаўленай мэты?

-Як вы думаеце, а ці могуць аказваць жыццёвыя каштоўнасці ўплыў на жыццё чалавека? Давайце абмяркуем адно невялікае апавяданне.

*У адной краіне жыла бабулька. Многія гады яна хадзіла з палкай па пляжы ў разгар летняга сезону. Людзі здзіўляліся і не разумелі, што яна шукае ў пяску, разграбаючы яго палкай.*

*Толькі праз гады людзі даведаліся, што на працягу многіх гадоў яна хадзіла па пляжы з адной толькі мэтай:* **<u>(якой ?) сабраць асколкі бітага шкла, каб дарослыя і дзеці не параніліся.</u>**

*Від дзейнасці: абмеркаванне ў групах*

**Пытанні навучэнцам:**

-Ці многага дасягнула ў жыцці гэтая бабулька?

-Як вы думаеце, які быў яе шлях па лесвіцы жыцця?

-Якія былі яе жыццёвыя каштоўнасці?

**Класны кіраўнік.** Паслухайце яшчэ адну **прытчу.**

*Калісьці даўно стары індзеец адкрыў свайму ўнуку адну жыццёвую ісціну: – У кожным чалавеку ідзе барацьба, вельмі падобная на барацьбу двух ваўкоў. Адзін воўк уяўляе зло – зайздрасць, рэўнасць, эгаізм, амбіцыі, хлусню. Другі воўк ўяўляе дабро – свет, любоў, надзею, ісціну, дабрыню, вернасць...*

*Маленькі індзеец, крануты да глыбіні душы словамі дзеда, на некалькі імгненняў задумаўся, а потым спытаў:*

*– А які воўк у канцы перамагае?*

*Стары індзеец ледзь прыкметна ўсміхнуўся і адказаў:*

*– Заўжды перамагае той воўк,......***<u>якога ты корміш.</u>**

*Від дзейнасці: абмеркаванне ў групах*

**Класны кіраўнік.** Часы не выбіраюць. Але кожны з нас можа выбраць, якога ваўка ў сабе ён хоча і будзе карміць. Кожны з нас можа выбраць, з якім ваўком ён хоча і будзе атаясамляцца. Добра было б дапоўніць старую прымаўку: *«Не столькі чалавек чалавеку воўк, колькі кожны сам сабе воўк, прычым і першы, і другі».*

**Класны кіраўнік.** За невялікі прамежак свайго жыцця вы зрабілі дастаткова многа жыццёвых крокаў. Я прасіла вас дома паспрабаваць вызначыць, якія з іх былі значнымі, важнымі. **<u>(Лесвіца дасягненняў</u>**)

<u>(Выхаванцы чытаюць свае «лесвіцы дасягненняў» і прымацоўваюць іх да дошкі).</u>

**Класны кіраўнік.** Я жадаю вам, дзеці, у вашым штодзённым жыцці здабываць з яго ўсё лепшае, задавольвацца тым, што маеце, ставіць перад сабой высокія мэты і дабівацца іх ажыццяўлення. Толькі тады вы будзеце па-сапраўднаму шчаслівымі людзьмі і пражывеце сваё жыццё асэнсавана.

**IV. Этап падвядзення вынікаў**

**Класны кіраўнік.** Для людзей характэрны дзве жыццёвыя пазіцыі: ***«жыццё для другіх» і «жыццё для сябе»***. Вядомы псіхатэрапеўт, кандыдат медыцынскіх навук **Міхаіл Яфімавіч Літвак** сцвярджае, што жыць трэба для сябе, бо самая важная персона для кожнага з нас – гэта мы самі. Жыць трэба для сябе, гэта прыносіць карысць іншым. *«Палюбі бліжняга свайго, як самога сябе»,* – гучыць Евангельская запаведзь.

**Заданне:** перад вамі «Шалі жыцця», назавем іх умоўна так. Якая пазіцыя найбольш прымальная для вас?

*Від дзейнасці: калектыўная работа*

**Класны кіраўнік**. І ў заключэнні яшчэ раз паглядзім на створаныя вамі лесвіцы жаданняў і ўважліва паслухаем наказ вядомага педагога **В. А. Сухамлінскага**: «Вы жывеце сярод людзей. Кожны ваш учынак, кожнае ваша жаданне адлюстроўваецца на людзях. Ведайце, што існуе мяжа паміж тым, што вам хочацца, і тым, што можна. Вашы жаданні – гэта радасць або слёзы вашых блізкіх. Правярайце свае ўчынкі свядомасцю: ці не прычыняеце вы зла, непрыемнасцей, нязручнасцей людзям сваімі ўчынкамі. Рабіце так, каб людзям, якія акружаюць вас, было добра ...».

**Класны кіраўнік**. Давайце яшчэ раз звернемся да эпіграфа: **«Жыццё – гэта гара: падымаешся павольна, спускаешся хутка».**

-Як вы разумееце гэтыя словы ў канцы нашага занятку?

-Падыдзіце ўсе да дошкі. Паглядзіце яшчэ раз на свае лесвіцы жаданняў і дасягненняў. Якое жаданне самае запаветнае? Якое дасягненне самае значнае? Што вы зробіце для таго, каб усе вашы мары збыліся?

*(Адказы-разважанні падлеткаў)*

**V. Рэфлексіўны этап**

Прыём **«Тэлеграма». Заданне**: напісаць коратка самае важнае, што ўсвядоміў на занятку, з пажаданнямі аднакласніку, і адправіць (абмяняцца). Можна напісаць пажаданне самому сабе.

*Від дзейнасці: індывідуальная работа*

***Дэвіз класа:***

Наш клас – гэта проста сузор'е зорак!
Пра гэта пакуль ведаем толькі мы самі!
Але хутка, вельмі хутка, запаляцца ўсюды
зоркі з нашымі імёнамі!

*(Выхаванцы выходзяць да дошкі і ўсе разам чытаюць дэвіз)*